20 год Гродзенскай дыяцэзіі (34)

Аўтар: Рэдакцыя
07.10.2012 01:00



2009 год

30 мая - У гродзенскай катэдры кс. бп Аляксандр Кашкевіч удзяліў святарскія пасвячэнні дыяканам Андрэю Лішко і Аляксандру Багдановічу.

13 чэрвеня - Рэліквіі св. Антонія былі ўведзены ў парафію св. Антонія ў Малой Бераставіцы.

15 – 18 чэрвеня - У Гродне адбылася I Парафіяда дзяцей і моладзі Гродзенскай дыяцэзіі. † 18 чэрвеня - Дыяцэзіяльнае выдавецтва выдала ў друк новы малітоўнік “Веру ў жыццё вечнае” (тыражом 3 тысячы экзэмпляраў).

18 – 21 чэрвеня - Адбылася I Пілігрымка ўрачоў у Чанстахову. Яе правадніком быў апякун урачоў кс. Андрэй Радзевіч.

29 чэрвеня - У парафіяльным касцёле ў Ражанцы ксёндз біскуп асвяціў фігуры святых Пятра і Паўла.

5 ліпеня - “Caritas” У дыяцэзіяльным санк-туарыі ў Тракелях адбылася каранацыя абраза Маці Божай Тракельскай. Каранацыю здзейсніў кс. кардынал Казімір Свёнтэк.

30 ліпеня - У шпіталі ў Турку (Польшча) памёр кс. прэл. Мар’ян Маргуж, шматгадовы выкладчык гісторыі Касцёла ў ВДС у Гродне.

23 жніўня - У пабрыгіцкім касцёле вечныя шлюбы склалі сёстры: Клара Волчэк, Агнэс Астравух, Антонія Шэйгерэвіч, Юзэфа Канаева.

6 верасня - У Войстаме адбылося ўра-чыс-тае асвячэнне касцёла Найсвяцейшай Тройцы. Урачыстую св. Імшу ўзначаліў кс. бп. Аляксандр Кашкевіч. Быў асвечаны таксама ўстаноўлены каля касцёла помнік Яна Паўла II.

9 – 15 верасня - Кс. бп Аляксандр здзейсніў кананічную візітацыю дэканата Дзятлава.

12 верасня - У Слоніме з нагоды 10-й гадавіны беатыфікацыі сясцёр непакалянак урачыстую св. Імшу адправіў кс. бп Казімір Велікаселец.